ДЗЕДЗІЧ
ЗБЕРАГЧЫ І ПАВЯЛІЧНЫ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
# ДЗЕДЗІЧ
*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*
**№ 2 (21)**
**САКАВІК2003**

2 ЧАЛАВЕК У ЧОРНЫМ. трансфармацыя вобразу палітыка №1
6 ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР: САКАВІК – ЧАС АБУДЖЭННЯ
4 ПІРСІНГ. МАСТАЦТВА САМАВЫЯЎЛЕННЯ
8 БЕЛАРУСЫ НА ЕЎРАБАЧАННІ?!

# ЧАЛАВЕК, ЯКІ НЕ ПРЫЗНАЕ КАМПРАМІСАЎ



14 САКАВІКА Ў ЦЭНТРЫ ІМ. У. КАЛЕСНІКА, ШТО Ў СТАРЫМ БУДЫНКУ БрДУ, АДБЫЛАСЯ СУСТРЭЧА З ВЯДОМЫМ БЕЛАРУСКІМ ПАЭТАМ, ГРАМАДСКІМ ДЗЕЯЧОМ ГЕНАДЗЕМ БУРАЎКІНЫМ, ЯКІ НАВЕДАЎ БЕРАСЦЕ ПА ЗАПРАШЭННЮ "ДЗЕДЗІЧА". СУСТРЭЧЫ З ДЗЕЯЧАМІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў СЦЕНАХ УНІВЕРСІТЭТА ЎЖО СТАЛІ ДОБРАЙ ТРАДЫЦЫЯЙ. АМАТАРЫ БЕЛАРУСКАГА СЛОВА З НЕЦЯРПЛІВАСЦЮ ЧАКАЮЦЬ НОВЫХ ГАСЦЕЙ, БО ДА НЯДАЎНЯГА ЧАСУ ПАДОБНЫЯ ВІЗІТЫ БЫЛІ ДЛЯ НАШАГА МЕСТА ВЯЛІКАЙ РЭДКАСЦЮ.

Як сказаў у сваёй прадмове Мікола Мішчанчук, прафесар філалагічнага факультэта БрДУ, "Генадзь Бураўкін - чалавек, які не прызнае ніякіх кампрамісаў, паэт, без якога немагчыма ўявіць гісторыю беларускай літаратуры". Наконт такой з'явы як згодніцтва, гатовасці ісці насуперак уласнаму сумленню, Бураўкін сказаў у адным са сваіх вершаў:

Ах, кампрамісы, кампрамісы...
І рукі выпускаюць сцяг.

Пры тым, што асноўны кантынгент прысутных на сустрэчы складалі дзяўчыны, вельмі дарэчы прыйшліся прачытаныя паэтам вершы пра каханне, якія ўвайшлі ў ягоны зборнік лірыкі "Чытаю тайнапіс тваіх вачэй". Акрамя гэтага, гучалі вершы грамадзянскага зместу. І якраз гэтай тэматыцы была прысвечаная большасць пытанняў, якія задаваліся шаноўнаму госцю.

Адказваючы на пытанне пра Нацыянальны Сход інтэлігенцыі, які адбыўся 16 сакавіка і адным з ініцыятарам якога з'яўляўся Генадзь Бураўкін, паэт зазначыў, што задачай схода з'яўляецца "аб'яднанне сіл і розуму інтэлігенцыі, каб не аддаць незалежнасць Беларусі. Падказаць уладзе канкрэтныя шляхі выхаду з эканамічнага і духоўнага крызісу. Ці захочуць слухаць нас улады - не ведаю". Па ягоных словах, "уладзе не хапае адчування рэальнасці. Яна не можа разабрацца, хто сапраўды таленавіты, а хто папросту выкарыстоўвае момант".

Вельмі актуальнай была гаворка пра вымушаную эміграцыю Васіля Быкава. Моцна ўсхваляваны і занепакоены такім станам рэчаў, калі лепшыя людзі краіны вымушаны ад'язджаць за мяжу, спадар Генадзь казаў, што і сам Быкаў надзвычай заклапочаны сваім адрывам ад Бацькаўшчыны.

Гаворачы пра стан сучаснай беларускай літаратуры, сп. Бураўкін прызнаўся, што не так уважліва сочыць за маладымі. "Цяпер выдаецца маса часопісаў, кніжак. І сярод гэтай масы цяжка знайсці нешта сапраўды вартае ўвагі. Тыя, каго я ведаю, і каго б я асабліва адзначыў, гэта празаікі Юры Станкевіч, Андрэй Федарэнка, паэты Анатоль Сыс, Віктар Жыбуль.

Вельмі пазнавальным атрымалася абмеркаванне літаратуры беларускай эміграцыі. Пазіцыя паэта ў гэтым пытанні была даволі цвярозая.

Вось што ён сказаў на гэты конт: "Эміграцкая літаратура - вельмі цікавая старонка нашай культуры. Але ў нас бывае кіданне са скрайнасці ў скрайнасць. Нібыта эміграцыя выратавала гонар беларускай літаратуры. Бясспрэчна, гэта старонка, якая павінна быць у гісторыі літаратуры. Але ў іх, усё ж такі, няма творцаў узроўню Танка, Куляшова, Быкава, Брыля".

Па заканчэнні прысутныя мелі магчымасць набыць кнігі госця (а таксама іншых аўтараў) і атрымаць аўтограф. Спадарыня Людміла Несцяровіч, прадстаўніца сталічнага выдавецтва "Кніга", падарыла студэнтам сапраўднае кніжнае свята, арганізаваўшы продаж рэдкіх для нашага горада выданняў беларускіх літаратараў па коштах вытворцы.

На развітанне госці выказалі надзею, што падобныя літаратурныя рэйды будуць больш частымі.

**Сяржук ПРЫЛУЦКІ**




**Аўтограф Генадзя Бураўкіна ва ўласнай бібліятэцы – што можа быць больш каштоўным?!**

## АДНЫМ РАДКОМ

### НАВІНЫ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Клуб "Дзедзіч" працягвае выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб'явы аб конкурсах праектаў і стыпендый і, безумоўна, крыху гумару.

Рассылка будзе штотыднёвай, але чым больш будзе навін, тым часцей яна будзе выходзіць. Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і плануемыя.

Калі вы ведаеце МА ў вашым рэгіёне, якія былі б зацікаўлены ў атрыманні нашай рассылкі і ў асвятленні сваёй працы на яе старонках, просім паведаміць нам іх кантакты.

Падпісацца на рассылку можа любы жадаючы. Трэба толькі даслаць ліст на адрас: dzedzich@mail.ru.

**Dzedzich week-news**

### ЭКОЛАГІ ВЫРАШЫЛІ СКААРДЫНАВАЦЦА

У суботу, 1 сакавіка, у Фондзе "Наша Вежа" прайшоў круглы стол экалагічных грамадскіх арганізацый Берасцейшчыны.

На пасяджэнні былі абмеркаваныя праблемы супрацоўніцтва экалагічных арганізацый паміж сабой і з дзяржаўнымі органамі. Цікава, што сярод удзельнікаў круглага стала была прадстаўніца абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя спн. Любоў Пахомава. Па яе словах, дзяржаўныя экалагічныя службы зацікаўлены ў існаванні і развіцці незалежных экалагічных арганізацый і адкрыты для супрацоўніцтва з імі.

Удзельнікі пасяджэння прынялі рашэнне аб стварэнні ў Берасцейскай вобласці Рэгіянальнага грамадскага каардынацыйнага экалагічнага савета (РГКЭС), асноўнай мэтай якога павінна стаць каардынацыя дзейнасці экалагічных ГА вобласці.

Каардынатарам дзейнасці на першапачатковы перыяд абраны Старшыня Рады ГА "Баранавіцкі экалагічны саюз", дэпутат Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў сп. Анатоль Банкевіч.

Савет адкрыты для ўваходу новых сяброў з ліку экалагічных грамадскіх арганізацый і ініцыятыў вобласці.

Наступнае пасяджэнне РГКЭС адбудзецца напярэдадні 1 траўня, і на ім, хутчэй за ўсё, будзе прынята канкрэтная праграма сумеснай дзейнасці экалагічных ГА.

Па дадатковую інфармацыю звяртайцеся: (163) 45-87-06; 41-32-59 (Анатоль Банкевіч).

**Dzedzich week-news**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**
**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА"**
**з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, якія пабачыць свет у канцы красавіка 2003 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 22-90-97 да 15.04.03.**

# ЧЕЛОВЕК В ЧЁРНОМ

## ЧАСТЬ ПЕРВАЯ

ОДЕВАЯСЬ, ЧЕЛОВЕК НА САМОМ ДЕЛЕ «РАЗДЕВАЕТСЯ», ПОРОЙ ДЕМОНСТРИРУЯ ОКРУЖАЮЩИМ ГОРАЗДО БОЛЬШЕ, ЧЕМ ХОТЕЛ БЫ САМ. ЖЕСТЫ, МАНЕРЫ И ПРИВЫЧКИ МОГУТ РАССКАЗАТЬ О ЛЮДЯХ БОЛЬШЕ, ЧЕМ СКАЗАННЫЕ ИМИ СЛОВА. КОРРЕСПОНДЕНТ «БЕЛОРУССКОЙ ГАЗЕТЫ» ПРОСМОТРЕЛА ОКОЛО СОТНИ ВИДЕОСЮЖЕТОВ, ЗАПИСАННЫХ ЗА ВРЕМЯ ПРЕБЫВАНИЯ У ВЛАСТИ БЕЛОРУССКОГО ПРЕЗИДЕНТА. ВОЗМОЖНО, НЕКОТОРЫЕ НАБЛЮДЕНИЯ О ЕГО МАНЕРЕ ОДЕВАТЬСЯ И ВЕСТИ СЕБЯ ПРЕДСТАВЯТ ИНТЕРЕС ДЛЯ НАШИХ ЧИТАТЕЛЕЙ.

Первое появление Лукашенко перед камерой в качестве президента - его прощание со Шкловщиной. Лукашенко одет в пестрый клетчатый пиджак и однотонные брюки явно от другого костюма. Мятый воротничок, сирийский галстук, торчащие усы и гордо реющая над лысиной непокорная прядь. И натуральный румянец во всю щеку, навевающий мысли о парном молоке от коровы Милки, сеновале и плодотворной работе на свежем воздухе.

Глядя на недавнее выступление Лукашенко на «Славянском базаре», невозможно поверить, что это - тот же человек. Безукоризненно сидящий костюм, жесткий воротник дорогой сорочки и шелковый, в тон костюму галстук, цена которого в несколько раз превышает президентскую месячную зарплату. И, что немаловажно, голова и усы подстрижены приличным парикмахером. Здоровый румянец разделил судьбу Милки.



В начале президентства Александр Григорьевич особого внимания на свой внешний вид не обращал. Оператор ОРТ Сергей Гельбах вспоминает, как в 1995г. он отказался снимать Лукашенко, когда тот вышел к журналистам взмокшим, со сдвинутым на бок галстуком и своей «фирменной» прядью, дыбом восставшей над лысиной. На вопрос - почему? - Гельбах ответил, что президент у него в кадре должен выглядеть как президент, а потому неплохо было бы причесаться, промокнуть пот и поправить галстук. По словам Гельбаха, критика была принята благосклонно, Лукашенко лишь ругнулся на родное БТ, которое его внешний вид вполне устраивал.

### ДЬЯВОЛ – В ДЕТАЛЯХ

Путь президента к приличному внешнему виду был долог и извилист, исполнен конфузов и любопытных дизайнерских решений. Ко времени своей первой пресс-конференции Лукашенко уже избавился от клетчатого пиджака и облачился в черный, плохо сшитый костюм с неровными плечами и дешевую сорочку от отечественного производителя. Мятые воротнички президентских сорочек еще больше года будут бросаться в глаза на фоне безукоризненных воротничков Булахова, Гончара, Карпенко. Примерно столько же его будут приучать застегивать верхнюю пуговицу под узлом галстука.

Отношения с галстуками у А.Г. вообще складывались весьма сложно. Им на президентской шее было явно не по себе. Они душили, мешали, раздражали. Их хотелось снять или хотя бы распустить узел. Галстук отравил ему жизнь в момент наивысшего триумфа - принятия президентской присяги, поскольку в самые ответственные минуты, когда звучал государственный гимн, камера увековечила не только орлиный взгляд молодого президента, но и дурашливо свернутый на бок галстук, который свел на нет всю торжественность момента.

Мужчине, который не знает, какой галстук подойдет к рубашке, обычно дает советы жена. Отсутствие Галины Родионовны ощущалось в каждом выходе президента на люди. С 1994 по 1998гг. галстуки Александра Григорьевича особым шиком не отличались. Разве что периодически повторялся один и тот же мотив - «ленинская» крапинка на темно-синем фоне. Любимый головной убор - шляпа «а-ля Саддам». Дьявол прячется в деталях.

1995г., визит Ельцина в Минск. На фоне ухоженного Бориса Николаевича Лукашенко в ратиновом пальто, долгое время выполнявшем функцию форменной одежды советской номенклатуры, «тянет» на секретаря обкома. Ему не важно, что в 1995г. ратин был не в моде, просто такое пальто, виденное в детстве на партийных и хозяйственных лидерах, полностью соответствовало его представлению о хорошей одежде.

Костюмы Лукашенко предпочитал темно-синего или глухого черного цвета. Говорят, что черный в одежде - цвет защиты, в него «прячутся», им отгораживаются от окружающего и окружающих. Президент откровенно предпочитает черный остальным цветам. Когда Татьяна Худобина в своей передаче на телеканале РТР, вышедшей в эфир накануне последних выборов, «нечаянно» находит Александра Григорьевича в жаркий летний день на строительстве кольцевой дороги, он предстает перед зрителями в черных брюках, черной тенниске и черной же бейсболке. Черный - традиционно и беспроигрышно.

Самым больным местом президента долгое время оставалась прическа, а точнее, стыдливо прикрывающая лысину прядь. Он годами не мог смириться с естественной потерей волос и старательно выкладывал на голове оставшуюся растительность. По мнению психологов, за стремлением прикрыть волосами шею, уши, лысину скрывается подспудное желание скрыть таким образом от чужих взоров свои недостатки и (как это уже было с черным цветом) спрятаться от окружающих. Если выкладки психологов верны, то более всего президенту хотелось скрыться и закрыться в период референдума 1996г., когда его волосы достигали просто неприличной длины.

(продолжение на стр. 3)

# ЧЕЛОВЕК В ЧЁРНОМ
## ЧАСТЬ ВТОРАЯ

**ПОЛИТИЧЕСКИЙ МАСКАРАД**

Политик меняет костюмы в зависимости от среды, в которой ему приходится вращаться, и общества, с которым ему приходится общаться. Накануне референдума Александр Григорьевич перед камерами кладет кирпичи в метро в синем ватнике, на голове - шапочка с легкомысленным помпоном. От типичного пролетария его отличает лишь то, что рабочая одежда абсолютно чиста, а из-под ватника выглядывает белоснежная футболка.



Еще один сюжет снят в магазине, куда Лукашенко на заре своей президентской карьеры лично явился наводить порядок. Он одет в дешевую куртку из плащевки, из-под которой выглядывают пуловер цвета полупроцентного молока и голубая сорочка. Вплотную (!) окруженный народом, он практически ничем от этого народа не отличается, и выглядывающий из-за его плеча охранник одет гораздо шикарней своего патрона.

Сегодня президент не ходит в магазины, создавая образ «своего парня» иными средствами. Он играет на гармошке, любит кабацкую лирику Есенина, уважает баньку («Я парюсь по-мужски, 120 - 130, иногда - 140, уши сворачиваются»), на «Дажынках-2000» вальсирует с обмирающей от восторга красоткой в национальном костюме, приставляя ногу, как на танцах в сельском клубе. О себе по-прежнему говорит в третьем лице - «президент решает», «президент должен думать», будто так до сих пор и не смог отождествить себя с должностью, которую занимает уже восемь лет.

**(Продолжение в следующем номере)**

**«Белорусская газета»**

# ХТО БЯДНЕЙ: БЕЛАРУС ЦІ ПАПУАС?

БЕЛАРУСКІЯ ЎЛАДЫ РАСПАЧАЛІ РЭАЛІЗАЦЫЮ ПРАГРАМЫ ПА ПРАДУХІЛЕННЮ БЕДНАСЦІ.

Перад нашай уладай нечакана паўстала пытанне: колькі беднякоў у краіне? Трэба ж палічыць, колькім трэба даваць датацыі, а колькі і так пражыве. Разам з партнёрам па праграме – прадстаўніцтвам ААН у Беларусі, – яны пачалі падлік. Нашыя асобна і ААН асобна. Цікава, што вынікі неяк трошкі разышліся – ААН палічыла, што ў краіне каля 30% жыхароў – беднякі, а ўлада называе лічбу – 7%. Так хто ж з іх лічыць не ўмее?

Як аказалася, і тыя граматныя і тыя. Але ж у ААН усё неяк да агіды проста: бедным лічыцца той, чый штодзённы прыбытак менш за 1 даляр ЗША (60 тысяч беларускіх рублёў у месяц). А у нас... Як высветлілася, у Беларусі падвоеныя стандарты: існуе мінімальны спажывецкі бюджэт (120 тысяч беларускіх рублёў у месяц), а для налічэння датацый выкарыстоўваецца іншае паняцце – бюджэт пражытачнага мінімума (каля 88 тысяч тых жа самых рублёў). Як бачыцце, ў гэтых "бюджэтах" існуе разрыў каля 32 тысяч рублёў.

Але ж не думайце, што у нас усё дрэна! Пасядзеўшы ды падумаўшы, кіраўніцтва краіны разам з міністэрствам сацыяльнай абароны вырашылі: няхай бедны будзе той, чый прыбытак у месяц менш за 60% ад бюджэта пражытачнага мінімума. Для тых, каму цікава, перавяду ў "нашыя звычайныя" - гэта 51 тысяча рублёў.

Хацелася б вас усіх павіншаваць, нашыя паважаныя чытачы! Як ні як гэта – чарговае дасягненне!

Падумайце, каб насіць ганаровае званне "бедны Папуас" трэба мець ажно 60 тысяч нашых рублёў у месяц, а для звання "бедны Беларус", хопіць і 51. Так што смела кажыце паўсюль і будзеце мець рацыю: "бедны Беларус бядней за беднага Папуаса!"

**Уладзімір ТАРНОЎСКІ**

# ЗА СІМВОЛІКУ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ

БРЭСЦКІЯ ЎЛАДЫ ЎСЁ Ж ТАКІ ЗНАЙШЛІ ДАДАТКОВЫ ПРЫБЫТАК ДЛЯ ГОРАДА.

Самае цікавае, што спосаб надзвычай просты. Не трэба шукаць нейкіх інвестыцый, падымаць вытворчасць... Усё проста – як і ў Астапа Бэндэра.

У канцы мінулага года берасцейкія гарадскія ўлады прапанавалі прыватным прадпрымальнікам, – уладальнікам таксовак, – змясціць на машынах герб горада. Ідэя не такая і дрэнная - папулярызацыя сімволікі горада, развіццё "патрыятычных пачуццяў"... Усе прадпрымальнікі пагадзіліся, за свае грошы набылі гербы і паклеілі іх.

На апошняй сесіі гарадскога савета мінулага года спадар І. Наумік, дэпутат гарадскога савета ад 2-ой выбарчай акругі г. Брэста, прапанаваў – за выкарыстанне сімволікі горада здымаць адпаведную плату з прыватных прадпрымальнікаў. Такая ідэя спадабалася дэпутатам – які-ніякі, а ўсё ж такі прыбытак. А тое, што гарадская ўлада сама навязала "вазіць" сімволіку прадпрымальнікам, нікога не кранула...

Дэпутаты прынялі рашэнне – за выкарыстанне сімволікі горада зняць з кожнага таксоўшчыка па 120 тысяч рублёў.

Думаю, нікога не здзіўляе, што прадпрымальнікі палічылі гэтае рашэнне "неправамоцным і нахабным". На экстраным сходзе прадпрымальнікі вырашылі ўсё ж такі сабраць і заплаціць гэтыя грошы. Але не ў гарадскую казну, а пералічыць іх на сацыяльны прыют, ці на іншыя падобныя установы. "Пасля гэтага мы здымем гербы і не будзем іх выкарыстоўваць, калі з нам так паступаюць", – распавёў адзін з уладальнікаў таксовак.

**Уладзімір ТАРНОЎСКІ**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ПРЫЕМНАГА АДПАЧЫНКУ НА МУХАЎЦЫ!

Прыемнага адпачынку на Мухаўцы жадаюць берасцейцам сябры БАМГА "Сузор'е".

7 сакавіка 2003 г. яны ўсталявалі на Набярэжнай ракі побач з прыстанню "Гродна" інфармацыйны стэнд, які заклікае адпачываючых больш беражліва адносіцца да чысціні роднага горада і не забруджваць раку побытавым смеццем.

Летась актыўная моладзь, сябры БАМГА "Сузор'е", неаднаразова праводзілі акцыі па ачыстцы ракі Мухавец ад смецця. Падчас такіх акцый пластыкавых стаканчыкаў і бутэлек, выцягнутых з вады, збіралася на 10-15 200-літровых пакетаў.

Маладыя людзі спадзяваліся, што гэтыя акцыі прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы забруджвання ракі. Бо выкінуць пустую бутэльку альбо паперку ў сметніцу не цяжка. Але на Набярэжнай сметніц, відаць, не хапае, таму што людзі, якія адпачываюць, на жаль, кідаюць смецце ў раку, ператвараючы наш горад у звалку.

Дзмітрый Шымански, адзін з ініцыятараў акцыі, кажа: "На 8 сакавіка жанчынам прынята дарыць кветкі. Мы хочам падарыць кветкі ўсім жанчынам нашага горада. Каб яны, гуляючы па Набярэжнай, маглі любавацца квітнеючымі лілеямі і гарлачыкамі, а не бутэлькамі".

Па словах арганізатараў, з дапамогай усталяванага стэнда яны хочуць прыцягнуць увагу грамадскасці і ўладаў да праблемы забруджвання ракі Мухавец і ўпарадкавання месцаў культурнага адпачынку.

Застаецца дадаць, што арганізатары акцыі выказваюць падзяку ТАА "Танга" і асабіста Аляксею Бяляеву за аказаную падтрымку ва ўсталяванні стэнда.

**Dzedzich week-news**

### АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАМПАНІЯ "ЗРОБІМ ЛЕПШ '03!"

Увесну стартуе агульнанацыянальная кампанія "Зробім лепш '03!". Яна будзе прысвечана Сусветнаму дню здароўя (7 красавіка).

Важнай справай у сённяшняй сітуацыі становіцца ўсталяванне плённых кантактаў паміж НДА і ўладнымі структурамі, найперш на ўзроўні мясцовых органаў, а таксама з прадстаўнікамі бізнэсу.

Гэтага таксама можна дасягнуць шляхам правядзення грамадзянскіх кампаній.

Мерапрыемствы кампаніі "Зробім лепш '03!" могуць тычыцца праблем алкагалізму, здароўя маладых маці, рэпрадукцыйнага здароўя нацыі і інш., іх спектр можа вар'іравацца ад правядзення навуковых канфэрэнцыяў і круглых сталоў, сацыялагічных апытанняў да акцый па ўпарадкаванню стадыёнаў, спартовых пляцовак і акцый-падзяк лекарам ("Кветка лекару і медсястры").

Шаноўныя сябры! Калі Вас зацікавіла ідэя кампаніі "Зробім лепш '03" і вы жадаеце далучыцца да яе, калі ласка, паведамце пра гэта ў Выканаўчае бюро.

e-mail: ngo@user.unibel.by
тэл.: (017) 225 51 10
тэл./fax: (017) 206 59 09
220030 г. Менск, а/с 82
http://www.ngo.unibel.by

**Dzedzich week-news**

# ДЫРКА В ТЕЛЕ

ВЕСНА... ИМЕННО В ЭТО ВРЕМЯ ГОДА У МЕНЯ ПРИЯТНО НАЧИНАЕТ ЩЕКОТАТЬ В ЖИВОТЕ, И ГЛАЗА ХИТРО БЕГАЮТ ТУДА-СЮДА. И ДУМАЮ, ЧТО НЕ У МЕНЯ ОДНОГО. А МОЙ КОТ УЖЕ ЧЕТВЕРТЫЙ ДЕНЬ НЕ ПОЯВЛЯЕТСЯ ДОМА... НО РЕЧЬ СЕГОДНЯ ПОЙДЕТ НЕ О МЕЖПОЛОВЫХ ОТНОШЕНИЯХ, А ЛИШЬ ОБ ОДНОМ ИЗ СПОСОБОВ ПРИВЛЕЧЕНИЯ ВНИМАНИЯ К СВОЕЙ ОСОБЕ. МЫ ПОГОВОРИМ О БОДИ-ПИРСИНГЕ.

Сразу должен предупредить: если молодой человек с серьгой в ухе до сих пор ассоциируется у вас с голубым небом и вызывает зуд в руках, то дальше читать не стоит. Лучше протрите свою лысину тряпочкой, наденьте спортивный костюм и, шурша туфлями, уйдите в леса. Итак, если теперь все свои, то можно продолжить.

Человек так уж устроен, что ему обязательно надо выделиться из толпы. Причем любым способом: умом, глупостью, прической, мобильным телефоном и т.д. А можно сделать дырку в теле и вставить в нее кольцо. Слово пирсинг (от англ. pierce -"прокалывать") появилось в нашей стране относительно недавно. Про девушку, пробившую уши, не говорили: "Она сделала себе пирсинг". А когда на улицах начали появляться проколотые носы и брови, – вот тогда-то и завертелось это модное слово на языках. Иногда тоже проколотых.

Но не надо думать, что идея "продырявить себе чего-нибудь" могла появиться только в молодых головах атомного XX века. Еще тысячи лет назад наши предки пробивали уши и носы, вставляли туда косточки и палки и шли пугать соседнее племя. Пирсинг пупка у древних египтян символизировал то, что данный человек



обладает общинными правами. Богатые римские центурионы, телохранители Юлия Цезаря, носили колечки в сосках как признак мужества и отваги, а чтобы просто так не болтались, крепили к ним свои плащи-накидки. Светские дамы Викторианской эпохи (конец XIX в.) отстаивали таким образом свою женственность, увеличивая размер и придавая более изящную форму груди. В царской России серьгу в ухо вставляли матросу, впервые пересекшему экватор.

Уверен, что многие планируют сделать себе пирсинг, как только потеплеет, чтобы хоть как-то обратить на себя внимание лиц противоположного пола. Мне кажется, стоит хорошо подумать перед тем, как проколоть себе пускай даже ухо. Ради очистки своей совести придумайте хотя бы ответ на простой вопрос: "Зачем?". В Штатах, например, существует закон, по которому тинейджерам до 14 лет запрещено заниматься пирсингом без согласия родителей. Хорошо это или нет, не мне решать, но лично я - сторонник обдуманных решений такого характера.




Многие любят рассказывать, как "вот этими самыми руками с помощью обыкновенной булавки пробивали себе (кому-то) ухо, бровь и т.д." Конечно, приятнее всего сделать что-то своими руками (пускай даже немного криво). Но не в этом случае. Пускай меня считают трусом, но я лучше доверюсь девушке в резиновых перчатках из салона, чем протертой водкой полуржавой игле от швейной машинки. Кажется, уже много об этом было сказано и написано...



Идеальный вариант, если перед походом в салон вы посоветуетесь со своим врачом, можно ли вам делать пирсинг. По крайней мере, знайте, что при некоторых болезнях лучше себя не дырявить. Это могут быть различные болезни крови, сердца и других внутренних органов. Если недавно вы перенесли сотрясение мозга, лучше подождать полгодика (заодно и проверите, насколько велико желание вдеть серьгу). Я не говорю уже о кожных и психических заболеваниях, а также аллергии на металлы.

Что касается самих "железок", то тут нужно помнить следующее. Нержавеющая сталь окисляется; свинцовый никель представляет собой сплав металлов, а значит аллергию может вызвать любой из компонентов сплава; что касается серебра и золота, то они подходят в основном для прокалывания ушей. Сертифицированные украшения из имплантационного хирургического нержавеющего сплава (медицинская сталь) или ниобия являются наиболее подходящими для пирсинга других частей тела. Но что-то в Бресте я последних не видел.

Вот, в принципе, и все, что я хотел рассказать. Более подробно об боди-пирсинге (особенно о прокалывании отдельных частей тела) можно без особых проблем узнать из специальной литературы или Интернета (хотя последнему не стоит слишком доверять). Так что дерзайте, но не злоупотребляйте.



**Денис ДЕНИСОВ**

# ЯГО ІМЁМ НЕ НАЗВАНЫ ВУЛІЦЫ НАШЫХ ГАРАДОЎ

НАПЯРЭДАДНІ 85-Й ГАДАВІНЫ АБВЯШЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ ХАЦЕЛАСЯ Б ПРЫГАДАЦЬ ПРА АДНАГО З НАЙБОЛЬШ АКТЫЎНЫХ ЯЕ ДЗЕЯЧАЎ - АЛЯКСАНДРА ІВАНАВІЧА ЦВІКЕВІЧА. ЁН НАРАДЗІЎСЯ Ў БРЭСТ-ЛІТОЎСКУ Ў 1888 Г., ЖЫЎ І ПРАЦАВАЎ ТУТ НА ПРАЦЯГУ ДОЎГАГА ЧАСУ.

Упершы перыяд свайго жыцця А.Цвікевіч не займаўся дзейнасцю, звязанай з нацыянальным беларускім рухам. У 1912 г. ён скончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта, пасля чаго стаў працаваць прысяжным паверапым (так раней называлі адвакатаў) у Берасці і Пружанах. Магчыма, А. Цвікевіч зрабіў бы тут нядрэнную кар'еру, калі б не Першая сусветная вайна, якая прымусіла яго, як і паўтара мільёна іншых жыхароў Беларусі, паехаць на Усход, ратуючыся ад наступаючых кайзераўскіх войскаў. Пабачыўшы на свае вочы тыя цяжкасці, якія прыходзілася цярпець беларускім бежанцам, ён пачынае працаваць у Тульскім камітэце дапамогі бежанцам. З гэтага моманту яго жыццё звязана з палітычнай дзейнасцю.

У 1917 г. наш зямляк стаў адным з заснавальнікаў Беларускай народнай Грамады, удзельнічаў у падрыхтоўцы і працы I Усебеларускага кангрэса, а праз тры месяцы пасля яго разгону бальшавікамі ўступае ў склад першага беларускага ўраду - Рады БНР - у якасці міністра юстыцыі. На працягу ўсяго існавання Рады (1918-1925 гг.) ён займаўся перш за ўсё дыпламатычнай дзейнасцю: удзельнічаў у перамовах з Украінскай Цэнтральнай Радай, з прадстаўнікамі Нямеччыны ў Брэст-Літоўску. Пасля падпісання Брэст-Літоўскага замірэння А. Цвікевіч узначаліў дэлегацыю БНР на перамовах у Версалі, дзе спрабаваў адстаяць інтарэсы Беларусі. У 1919 г. пачалася вайна паміж Расеяй і Польшчай, у выніку якой Беларусь аказалася падзеленай на дзве часткі: польскую і савецкую. Цвікевіч спрабуе апратэставаць Рыжскае замірэнне на Генуэзскай міжнароднай канферэнцыі, але яго ніхто не слухае.

У 1924 г. А. Цвікевіч стаў трэцім і апошнім міністрам ураду БНР у выгнанні (г. Прага, Чэхія) і ўзначальваў яго да кастрычніка 1925 г., калі ўрад аб'явіў пра самаліквідацыю. Праз месяц ён з сям'ёй вярнуўся ў Менск. На радзіме А. Цвікевіч заняўся навуковай і літаратурнай дзейнасцю. Праз пяць год пасля свайго вяртання ён быў арыштаваны і адпраўлены ў высылку ў Перм, дзе пражыў да 1937 г., калі яго арыштавалі зноў. Праз два тыдні пасля арышту дзеяч БНР быў расстраляны ў Менску.



**Алена ДЗЕМІДЮК**

*Народ, Беларускі Народ! (М.Багдановіч)*

# ДЗЕНЬ, ШТО МАЕ ВОДАР МІМОЗЫ

УЖО Ў СТАРАЖЫТНЫМ РЫМЕ ІСНАВАЎ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ, ЯКІ АДЗНАЧАЛІ МАТРОНЫ. У ГЭТЫ ДЗЕНЬ МАТРОНЫ - СВАБОДНА НАРОДЖАНЫЯ ЖАНЧЫНЫ, ЯКІЯ ЎЖО ЎЗЯЛІ ШЛЮБ, - АТРЫМЛІВАЛІ АД СВАІХ МУЖОЎ ПАДАРУНКІ. АКРАМЯ ТАГО, ГАСПАДЫНЯ ДОМА ДАЗВАЛЯЛА НЯВОЛЬНІЦАМ У ГЭТЫ ДЗЕНЬ АДПАЧЫВАЦЬ. АПРАНУТЫЯ Ў ЛЕПШАЕ АДЗЕННЕ, З ПРЫГОЖЫМІ ВЯНКАМІ НА ГАЛОВАХ, РЫМЛЯНКІ ПРЫХОДЗІЛІ Ў ХРАМ БАГІНІ ВЕСТЫ - АХОЎНІЦЫ ДАМАШНЯГА АЧАГА.

Прайшло шмат часу. Жанчыны вырашылі змяніць сваё жыццё, змагацца за роўнасць з мужчынамі.

8 сакавіка 1857 г. тэкстыльшчыцы Нью-¨рка прайшлі маршам па вуліцах горада, пратэстуючы супраць малых заробкаў і дрэнных умоў працы.

У 1908 г. ужо іх унучкі патрабавалі ў гэты дзень забароны дзіцячай працы, паляпшэння ўмоў на фабрыках і прадастаўлення жанчынам права голасу. У наступным годзе сацыялістычная партыя Амерыкі абвясціла апошнюю нядзелю лютага Нацыянальным жаночым днём.

А ў 1910 г. у Капенгагене на Міжнароднай канферэнцыі жанчын Клара Цэткін прапанавала штогод адзначаць Міжнародны жаночы дзень 8 сакавіка - у памяць пра даўнія нью-ёркскія падзеі. У 1911 г. упершыню гэтае свята адзначалі ў Аўстрыі, Даніі і Швейцарыі.

На прасторы былога СССР 8 сакавіка святкуецца з 1913 г. Адно з самых буйных выступленняў прайшло ў Петраградзе 7 сакавіка 1917г. А ў 1976 г. свята было афіцыйна прызнана ААН.

Так 8-е сакавіка стала 8-м сакавіка - святам і выхадным днём да радасці ўсіх працоўных неабдымнага СНД, незалежна ад полу і, як раней было модна казаць, класавай прыналежнасці.

З часам 8 сакавіка ператварылася ў адно з самых рамантычных і прыемных святаў года - у Міжнародны дзень Жанчын, і святкуем мы яго сёння як дзень Вясны, Прыгажосці і Кахання. Свята ўсіх маці, бабуляў, сястрычак і сяброўак, калі абсалютная большасць мужчын з усёй моцы стараецца быць клапатлівымі і мілымі, адзінымі і непаўторнымі, свята, калі лёгка адчуваеш сябе жанчынай.

І ўсё ж, чаго чакаюць жанчыны ў гэты дзень ад мужчын? У першую чаргу, увагі. З тымі, хто побач, у большасці выпадкаў больш-менш усё нармальна: традыцыйны сняданак у ложак, кветкі, падарункі і іншыя радасці сумеснага жыцця. Таму хочацца прыгадаць Вам, паважаныя мужчыны, пра тых, хто зараз ад Вас далёка, але каму таксама неабходна Вашая ўвага, цеплыня Вашых словаў. Варыянтаў такой увагі, таксама, як і падарункавых набораў у краме, мноства.

Ітак, **варыянт №1**. Вы накіраўваецеся ў любое аддзяленне сувязі і даеце віншавальную тэлеграму, не саромячыся сваіх пачуццяў і эмоцый. Чым больш шчыра, тым лепш. Тэлеграма абыдзецца Вам у сярэднім у 4 тысячы беларускіх разліковых адзінак, з разліку, што Вашыя пачуцці і эмоцыі змесцяцца ў 20 словаў, уключаючы адрас і святочны бланк з прыгожай паштоўкай. Калі не змесцяцца (да прыкладу, пачуццяў зашмат або адрасат знаходзіцца за межамі нашай неабдымнай радзімы), не на шмат больш.

Паверце, тэлеграма застаецца адной з самых прыемных формаў увагі, нават сыходзячы з нізкага кошту, прыемнага не толькі для атрымальніка, але і для адпраўніка.

Не хочаце тэлеграму, – замоўце аб'явы ва ўсе, альбо выбарна, газеты (**варыянт №2**). Няхай уся, да прыкладу, Берасцейская вобласць даведаецца пра прадмет Вашых мараў і пра тое, што адбываецца ў Вас на сэрцы (канешне, толькі светлае і добрае).

**Варыянт №3** – міжнародна-міжгародні. Тут тлумачыць асабліва няма чаго, галоўнае ўмець размаўляць і лічбы адрозніваць, - справіцца нават дзіця. Тэлефануйце, на здароўе.

**Варыянт №4** – Internet. Тое, што інтэрнэт – рэч карысная, даказваць, думаю, няма неабходнасці. Проста звяртаем Вашую ўвагу, што, акрамя святочных віншаванняў па электроннай пошце, праз інтэрнет можна адправіць святочную паштоўку са шматлікіх сайтаў, прысвечаных выключна гэтай справе. Справа нескладаная, нават прыемная, таму як дызайн, тэкст і колер паслання залежаць толькі ад Вашага густу і ступені роднаснасці з адрасатам. Механізм складання такой паштоўкі настолькі просты, што па сілах нават пачынаючаму карыстальніку Сеткі. Акрамя таго, у інтэрнэце створана мноства сайтаў, што ўтрымліваюць тэксты віншаванняў, тосты і іншыя карысныя рэчы, якія дапамогуць Вам бліскуча выглядаць на любой урачыстасці, быць у цэнтры ўвагі любой святочнай кампаніі.



Фота: IREX/ProMedia

Ну, вось і ўсё. Жадаем усім жанчынам прыемнага і незабыўнага свята, а мужчынам - хутчэйшага вырашэння ўсіх перадсвяточных клопатаў. Будзьце шчаслівыя і беражыце тых, хто Вас кахае. Са святам!

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**

**СМАЧНА ЕСЦІ!**

# СВЯТОЧНАЕ МЕНЮ ПА- БЕЛАРУСКУ

ПАВАЖАНЫЯ МУЖЧЫНЫ! КАБ ВЫ ВЕДАЛІ, НІХТО НЕ ПРЫДУМАЎ ЛЕПШАГА СПОСАБУ ЗРАБІЦЬ НЕЗАБЫЎНАЕ ЎРАЖАННЕ НА ЖАНЧЫНУ, ЯК ПРЫГАТАВАЦЬ САМОМУ СВЯТОЧНУЮ ВЯЧЭРУ. ТАМУ, КАБ ДОБРА ПАДРЫХТАВАЦЦА І ЗРАБІЦЬ ПРЫЕМНАЕ СВАІМ КАХАНЫМ ЖАНЧЫНАМ, ВЫ ПАВІННЫ ПРЫГАТАВАЦЬ ЯЕ СМАЧНА. У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ТРЭБА ПАКЛАПАЦІЦЦА ПРА СЕРВІРОЎКУ СТАЛА. ЯНА ПАВІННА БЫЦЬ СПЕЦЫФІЧНАЙ І СВЯТОЧНАЙ. Я ПРАПАНУЮ ВАМ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ВАРЫЯНТ: ПАКЛАДЗІЦЕ НА СТОЛ РАЗНАСТАЙНЫЯ РЭЧЫ, ПОСУД, ЗРОБЛЕНЫЯ З ГЛІНЫ, ДРЭВА, ЛАЗЫ, ШКЛА, САЛОМКІ, А ТАКСАМА ІНШЫЯ ЎПРЫГОЖВАННІ. КАЛІ БУДЗЕЦЕ ПАДАВАЦЬ СТРАВЫ, ЗВЯРНІЦЕ АСАБЛІВУЮ ЎВАГУ НА ІХ ВЫГЛЯД: ЯНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ Ў ТЫМ ПОСУДЗЕ, У ЯКІМ ГАТАВАЛІСЯ. І АПОШНЯЕ. КАЛІ ВАША ДАМА З'ЯЎЛЯЕЦЦА ДЛЯ ВАС САПРАЎДНЫМ ГАНАРОВЫМ ГОСЦЕМ, ВЫ ПАВІННЫ ПРАПАНАВАЦЬ ЁЙ МЕСЦА Ў ЦЭНТРЫ СТАЛА.

## ШЫЙКА ГУСІНАЯ З НАЧЫНКАЙ

Шыйку гусі асмаліць, пачысціць, прамыць, нацерці молатым перцам і соллю. Прыгатаваць рассыпістую грэцкую кашу, перамяшаць з дробна нарэзанымі і абсмажанымі на сале рэпчатай цыбуляй і кавалачкамі гусінай пячонкі, начыніць шыйку, зашыць з абодвух канцоў. Пакласці ў гаршок, змазаць тлушчам, дадаць крыху вады, дробна нарэзаны корань пятрушкі, рэпчатую цыбулю, лаўровы ліст, закрыць накрыўкай і паставіць у печ або духоўку.

**Складнікі:** 1 шыйка гусі, 0,5 шклянкі грэцкай крупы, гусіная печань, 50-80 г. тлушчу, 1 цыбуліна, 1 корань пятрушкі, лаўровы ліст, перац і соль.

## РЫБА, ТУШАНАЯ Ў ГАРШЧОЧКУ

Падрыхтаваную і нарэзаную кавалкамі рыбу пасаліць і пакласці ў гаршчок, дадаць сметанкавае масла, пасераваную цыбулю, лаўровы ліст, перац гарошкам. Шчыльна накрыць накрыўкай або цестам і паставіць у духоўку на адну гадзіну. Падаць у гаршчочку, на гарнір – звараную бульбу, пасыпаную зеленівам.

**Складнікі:** 1-2 кг. рыбы (судак, акунь і інш.), 80 г. масла, 4 цыбуліны, зяленіва, перац, спецыі, соль.

## ДЭСЕРТ: ЯБЛЫКІ, ПЕЧАНЫЯ З МЕДАМ

Кісла-салодкія яблыкі прамыць, вырэзаць асяродкі, адтуліны запоўніць цукрам, пакласці на бляху, паліўшы яе крыху вадой, і запячы ў духоўцы. Перад падачай на стол яблыкі паліць мёдам.

**Складнікі:** 500 г. яблыкаў, 150 г. мёду, 50 г. цукру.

**Марыя ЕСІНА**

**па матэрыялах кнігі І.П.Корзуна «Беларуская кухня»**

**ДАРЭЧЫ**

***

Прыходзіць малая дзяўчынка ў краму і кажа:
- Мне, калі ласка, 5 бутэлек гарэлкі.
- А ты іх данясеш, - пытаецца прадавец.
- Вось і я думаю: можа дзьве тут лупануць.

***

Два мужыка паехалі на рыбалку і ўпіліся ў дым. Ранкам вылязаюць з намёта - а за ім усё поле пераарана ды сеткі стаяць.

Першы:
- Ты дзе ўчора сеткі паставіў?!!
Другі:
- Дзе ты ўчора веславаў - там я і ставіў...

ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# САКАВІК –

## 1 САКАВІКА

1 сакавіка 1881г. беларускі тэрарыст **Ігнат Грынявіцкі** кінуў бомбу ў расейскага цара Аляксандра II. Акцыя была ўдалая, бомба разарвалася як трэба, і імператар быў забіты. Натуральна, у сучасніка такі акт выклікае супярэчлівыя пачуцці. Разумееш, што тэрарызм — гэта кепска, асабліва сёння. І адначасова не можаш не адчуваць гонар за свайго супляменніка Ігната Грынявіцкага, якому хапіла столькі волі, мужнасці, рашучасці зрабіць такі адчайны ўчынак для свайго краю, колькі сёння не хопіць бадай і сотні, а можа і тысячы нашых супляменнікаў.



1 сакавіка 1933г. пакінуў гэты свет адзін з любімых беларусамі паэтаў **– Уладзімір Жылка.** Паводле адной тэорыі, у беларусаў ёсць паэты вялікія, такія, як Купала і Колас, і любімыя, такія, як Максім Багдановіч. Бясспрэчна, да другіх належыць і Жылка. Трагічны лёс, фантастычныя вершы, вялікая будучыня. Некалі імем гэтага паэта будуць называць вуліцы ў беларускіх гарадах. А яшчэ ён – аўтар надзвычай тонкіх паэтычных рэфлексіяў пра Вільню, горад, які моцна любіў і ў якім марыў быць пахаваны.

Бывай, мой ранак срэбнаросы!
Бывай, мой дзень клапот, пакут!
Прайшоўшы свет раздзетым, босым,
Пара падумаць і пра кут:
На могілках зацішных Росы
Хачу спачыць ад каламут.
Сачыцьмуць мой спакой найпільней
Муры старой, каханай Вільні.

## 2 САКАВІКА



2 сакавіка 1608г. памёр **Канстанцін Астрожскі,** выдатны ваяк, пераможца расейскіх захопнікаў у бітве пад Воршай. Астрожскі вядомы не толькі вайсковымі справамі. ¨н – фундатар цэркваў. Збудаваныя на ягоныя грошы храмы і дагэтуль стаяць у старой сталіцы Вялікага Княства Літоўскага – Вільні.

2 сакавіка 1918г. нарадзіўся беларускі паэт **Алесь Бачыла.** ¨н паходзіць з вёскі Лешніца, што пад Пухавічамі. Шмат якія ягоныя вершы пакладзены на музыку і сталі вядомымі песнямі, такімі, як адзін з варыянтаў нацыянальнага гімна Беларусі "Радзіма, мая дарагая".

## 4 САКАВІКА

4 сакавіка 1634г. ў Лышчыцах, што пад Берасцем, нарадзіўся беларускі шляхціч **Казімір Лышчынскі,** які ў будучыні стаў славутым мысляром. Вучыўся Лышчынскі ў Берасцейскім езуіцкім калегіуме і ў духоўнай акадэміі ў Кракаве. Нейкі час працаваў выкладчыкам, пасля – юрыстам, а ўрэшце падаўся ў палітыку: быў паслом ад Берасця ў сойме Вялікага Княства. Пры тым Лышчынскі забаўляўся разважаў пра тое, як уладкаваны свет, і занатоўваў свае развагі на паперы. ¨н марыў пра стварэнне грамадства роўнасці і братэрства, жадаў бачыць "свет без улады, гарады без начальнікаў, народы без гаспадароў". Гэткай рэвалюцыйнай сцяжынай Лышчынскі прыйшоў да атэізму. У свае 53 гады ён піша «Трактат пра неіснаванне Бога».



**К.Лышчынскі.**
**Мастак С.Свістуновіч**

Натуральна, XVII ст. было зусім не той эпохай, калі атэістычныя выказванні маглі рабіцца беспакарана. Лышчынскага зняволілі, і ўрэшце соймавы суд прысудзіў яго да пакарання смерцю. Філосафа абезгаловілі, а пасля спалілі на вогнішчы.

## 5 САКАВІКА

5 сакавіка 1896г. прыйшоў на свет самы савецкі беларускі пісьменнік і навуковец **Кандрат Крапіва,** якога кожны беларус са школы ведае як таленавітага байкапісца.

## 7 САКАВІКА

7 сакавіка 1931г. пакінуў гэты свет **Павел Дземідовіч,** даследчык беларускай этнаграфіі і фальклёру. Паходзіць ён з той самай вёскі, што і Якуб Колас, – з Мікалаеўшчыны пад Стоўбцамі. Скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут, напісаў шмат працаў пра беларускія народныя святы. Напрыклад, "Калядныя святы", "Вялікдзень у сялян беларусаў", "Радаўніца на Беларусі", "Купалле ў беларускай вёсцы" ды іншыя.

І яшчэ адна падобная да папярэдняй дата. 7 сакавіка 1991г. хуліганы на адной менскай вуліцы забілі паэта **Анатоля Грачанікава.** На той момант Грачанікаў быў галоўным рэдактарам часопіса "Маладосць".

## 8 САКАВІКА

8 сакавіка 1892г. нарадзіўся **Алесь Чарвякоў,** кіраўнік Беларусі, які за савецкім часам, у 20-я гады здолеў разам з паплечнікамі правесці беларусізацыю краіны у сферы асветы і культуры. Паходзіць Чарвякоў з Дукоры, што пад Пухавічамі. У 1915г. ён скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут, быў адным са стваральнікаў беларускай сацыял-дэмакратыі, а пасля абвяшчэння БССР стаў старшынёй ураду. Тады Чарвякоў надта шмат ездзіў па ўсёй Беларусі, сустракаўся з людзьмі, марыў пра росквіт сваёй Бацькаўшчыны. Але ж нацыянальны росквіт за бальшавікамі не мог працягвацца доўга. У 30-я гады на Чарвякова пачалі пісаць даносы, яго сталі кляйміць у газетах. Тады ён зразумеў, што гэта канец усім ягоным памкненням і скончыў жыццё самагубствам. Шкада, бо згадваюць, што надта любімы быў у народзе кіраўнік. Больш любімых, мабыць, у Беларусі ў XX ст. і не бывала.

Кіраўнікі БНР не паспелі разгарнуцца ва ўсю моц, каб сапраўды ўзяць у рукі ўладу па ўсёй краіне. Перашкодзілі акупацыі – нямецкая, польская, пасля – савецкая. 8 сакавіка 1928г. пакінуў гэты свет першы прэзідэнт БНР **Пётра Крэчэўскі, наш зямляк, ураджэнец Кобрынскага павету.** ¨н памёр у Празе, калі ўрад БНР ужо некалькі гадоў існаваў на эміграцыі. І сёння на пражскіх Альшанскіх могілках ёсць помнік Пётру Крэчэўскаму, ля якога штогод на 25 сакавіка збіраюцца тутэйшыя беларусы і госці.



Паэт **Славамір Адамовіч** адзначае сёлета свае 42-я ўгодкі 8 сакавіка. Імя «песняра змагання і кахання» шырока загучала ў сярэдзіне 1990-х, калі за верш «Забі прэзідэнта» паэт трапіў за краты. Паэтычны зборнік Славаміра Адамовіча «Плавільшчыкі расы» стаўся бестселерам сучаснай беларускай літаратуры.

## 9 САКАВІКА



9 сакавіка 1883г. нарадзіўся **Францішак Аляхновіч,** беларускі драматург, адзін са стваральнікаў новага нацыянальнага тэатру. ¨н прыйшоў на свет у Вільні, скончыў драматычную школу ў Варшаве, пасля вярнуўся дадому і наладзіў тут першую беларускую вечарыну, дзе паставіў п'есу "Па рэвізіі" М.Крапіўніцкага, арганізаваў сваю Беларускую драматычную дружыну, разам з якой ставіў сваю першую ўласную п'есу "На Антокалі". Дарэчы, гэтую п'есу Аляхновіч напісаў у турме, куды быў пасаджаны расейскімі ўладамі напярэдадні І Сусветнай вайны. Пасля вайны Аляхновіч выдае ў Вільні розныя пэрыёдыкі і піша п'есы "Чорт і баба", "Бутрым Няміра", "Пан міністар", друкуе першую працу з гістарычнага тэатразнаўства "Беларускі тэатр". У 1926-м драматург апынаецца ў Менску, але тут яму працаваць не выпадае. Аляхновіча арыштоўваюць і высылаюць на Салавецкія выспы. Праз сем гадоў Саветы абмяняюць Аляхновіча на зняволенага ў Польшчы Браніслава Тарашкевіча, і драматург зноў апынецца ў роднай Вільні. ¨н адразу піша кнігу "У кіпцюрох ГПУ", якая па свежых слядах перакладаецца на сем еўрапейскіх моваў і першая распавядае свету праўду пра камуністычны рай. У часе апошняй вайны Аляхновіч працаваў у Беларускім нацыянальным камітэце ў Вільні. Тут ён і быў застрэлены на сваёй кватэры, як пішуць энцыклапедыі, ці то савецкімі, ці то польскімі партызанамі. Таямніца таго здарэння застаецца. Зрэшты, маглі яго ліквідаваць і немцы, і

# ЧАС АБУДЖЭННЯ

хто заўгодна. Бо не было тады такой сілы, якая б не супрацьстаяла беларускаму адраджэнцу. Усе чужыя былі настроеныя варожа.

9 сакавіка 1918г. Выканаўчы Камітэт Рады Усебеларускага З'езду прымае **Другую Устаўную грамату.** Беларусь абвяшчаецца Беларускай Народнай Рэспублікай, дэмакратычнай, парламенцкай і праватой дзяржавай. Заканадаўчая ўлада ў БНР перадаецца Радзе Усебеларускага З'езду, а выканаўчая – Народнаму Сакратарыяту Беларусі. Абвяшчаецца нацыяналізацыя зямлі, яе нетраў, лясоў і азёр. Як падумаеш, дык яшчэ і сёння ў Беларусі няма такой яснай палітычнай схемы. Праўда, і Другая Устаўная грамата была яшчэ не апошняй у свой час. У ёй не вызначаная дакладная тэрыторыя дзяржавы і характар дачыненняў БНР да іншых дзяржаваў.

## 15 САКАВІКА

15 сакавіка 1994г. была прынятая **Канстытуцыя РБ.** Першая канстытуцыя незалежнай Беларусі. Менавіта тая канстытуцыя ўводзіла ў краіне пасаду прэзідэнта, але не давала ніякіх гарантый ад аўтарытарнай мадэлі ўлады. Памылка выявілася неўзабаве. Прыйшоўшы да ўлады ў тым самым 1994 годзе, Аляксандр Лукашэнка перэтварыў прававую дзяржаву ў адзін вялікі саўгас і сканцэнтраваў усю ўладу ў сваіх руках, змяніў пад свой густ усё, у тым ліку і канстытуцыю, чым працягнуў свае паўнамоцтвы на два гады.

## 19 САКАВІКА



19 сакавіка 1887г. памірае **Юзаф Крашэўскі** – пісьменнік і гісторык, які належыць да польскай літаратуры, але паходзіць з беларускай шляхты з Пружан і ўсю сваю творчасць прысвяціў вывучэнню роднага краю. Вучыўся Крашэўскі ў Свіслацкай гімназіі і ў Віленскім універсітэце. У сярэдзіне XIX ст. ён быў рэдактарам віленскага часопіса "Атэнэум". Напісаў ажно 223 раманы, мабыць, лёгка яму тое давалася. А яшчэ ж пісаў паэмы, вершы, навуковыя працы ды падарожныя нататкі. Мабыць, каб столькі ўсяго стварыць, трэба ўсё жыццё тым толькі і займацца, што пісаць, пісаць, пісаць.

## 20 САКАВІКА

20 сакавіка 1440г. загінуў **Жыгімонт Кейстутавіч,** які восем гадоў быў Вялікім князем Вялікага Княства Літоўскага. Жыгімонт быў родным братам Вітаўта. На вялікакняскі трон яго пасадзілі магнаты-каталікі. А ён, каб схіліць на свой бок праваслаўных князёў, пачаў выдаваць для іх прывілеі, гарантаваў іх недатыкальнасць і вызваліў ад павіннасцяў і плацяжоў з маёнткаў. З іншага боку Жыгімонт задобрываў і Польшчу, аддаўшы ёй Валынь і Падолію. Такая непаслядоўная і кампрамісная палітыка выклікала незадаволенасць іншых феадалаў і Жыгімонт Кейстутавіч быў забіты князямі Чартарыйскімі ў выніку змовы. Акурат у такі самы сакавіцкі дзень...

20 сакавіка 1862г. ў Халопенічах нарадзіўся **Адам Багдановіч,** беларускі этнограф, бацька паэта Максіма Багдановіча. Адам Багдановіч нашмат перажыў свайго геніяльнага сына, ад чаго моцна пакутаваў і скардзіўся, што яму даводзіцца пісаць успаміны пра Максіма, а не наадварот. Быў ён чалавекам амбітным і не надта верыў у будучыню беларушчыны. Аднак паспеў перакацца ў марнасці свайго недаверу на прыкладзе сына.

## 22 САКАВІКА



22 сакавіка 1786г. нарадзіўся **Яўхім Лялевель,** знакаміты гісторык і грамадскі дзеяч. Дарэчы, маці Лялевеля Шалюта паходзіла з Беларусі.

Сам ён скончыў Віленскі універсітэт, дзе пасля меў кафедру гісторыі. Калі расейскія ўлады раскрылі студэнцкія таварыствы філаматаў і філарэтаў, кафедру ў Лялевеля адабралі, бо ён быў ідэйным натхняльнікам студэнтаў. Тады ён бярэ ўдзел у паўстанні 1831 года, займаецца арганізацыйнай працай па-за радзімай, у Парыжы і Брюсэлі.

А пахаваны Лялевель у Вільні, на могілках Роса. У сваіх гістарычных працах ён шмат пісаў пра нацыянальныя правы беларусаў і літоўцаў.

22 сакавіка 1864г. у Вільні на Лукіскім пляцы мураўёўцы павесілі **Кастуся Каліноўскага.** Цяпер на месцы гібелі змагара ёсць мемарыяльная табліца. Але дакладнае месца пахавання Каліноўскага невядомае. ¨сць звесткі, што магіла яго – недзе ў замкавай Гедымінавай гары. Нібыта яшчэ ў міжваенны час удзячныя нашчадкі паставілі на тым месцы крыж. Але цяпер ад таго крыжа не засталося ані знаку.



22 сакавіка 1943г. гітлераўцы спалілі беларускую вёску **Хатынь** разам з людзьмі. А была гэта невялікая вёска, 26 двароў. Учыніў экзэкуцыю карны атрад эсэсаўцаў обэрштурмбанфюрэра Аскара Дзерлівангера. У агні згарэлі 149 хатынцаў, у тым ліку 75 дзяцей. Сёння на месцы спаленай вёскі збудаваны мемарыял. Хатынь – адна з многіх спаленых у вайну беларускіх вёсак. ¨сць меркаванне, што менавіта яна абраная за сімвал, бо яе назва сугучная з назваю Катыні на Смаленшчыне, дзе савецкія карнікі знішчылі тысячы польскіх афіцэраў. І зроблена гэта было, каб заблытаць звесткі – хто дзе калі і каго забіваў – і такім чынам зацерці праўду пра трагедыю Катыні. Трэба мець на ўвазе, што і за афіцыйнай легендай хатынскай трагедыі застаецца шмат няяснага. Гадоў дзесяць таму, калі паадкрываліся архівы, у друк патрапілі звесткі пра тое, што хатынцаў спалілі не немцы, а карны ўкраінскі батальён. Сталі вядомыя і некаторыя дэталі трагедыі. Напярэдадні здарэння савецкія партызаны на дарозе каля Хатыні забілі нямецкага афіцэра, любімчыка Гітлера. Вось жа спаленне вёскі фашыстамі было наўпрост справакаванае так званымі народнымі мсціўцамі...

Так ці інакш, а поўная праўда пра хатынскую трагедыю яшчэ не распаведзеная. Бясспрэчным застаецца і застанецца толькі факт злачынстваў, якім не будзе тэрміну даўнасці.

## 25 САКАВІКА




Паштоўка БНР

25 сакавіка – найважнейшае свята ў гісторыі незалежнай Беларусі. Менавіта ў гэты дзень у 1918г. у Менску была **абвешчана незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі.**

Цікава, што Трэцяя Ўстаўная Грамата была прынятая з ініцыятывы Віленскай Беларускай Рады на чале з Антонам Луцкевічам. Пакуль менскія беларусы яшчэ крыху вагаліся, віленскія рашуча настойвалі на поўнай незалежнасці краіны.

Цяпер Беларусь мусіла сама стварыць свае органы ўлады і ўсталяваць міжнародныя дачыненні з іншымі краінамі.

У Грамаце названыя канкрэтныя тэрыторыі, якія павінны ўвайсці ў склад БНР: Магілёўшчына, Меншчына, Гарадзеншчына (з Горадняй і Беластокам), Віленшчына, Віцебшчына, Смаленшчына, Чарнігаўшчына і сумежныя часткі суседніх губерняў, заселеныя беларусамі (меліся на ўвазе часткі Сувалкаўскай і Ковенскай губерняў).

З тых часоў і да сёння 25 сакавіка – найважнейшае нацыянальнае свята свядомых беларусаў ва ўсім свеце. У гэты дзень праводзяцца ўрачыстыя набажэнствы і акадэміі, а ў Менску ды іншых гарадах Беларусі апошнія 10 гадоў людзі выходзяць на святочныя дэманстрацыі і мітынгі.

## 28 САКАВІКА

28 сакавіка 1985г. пакінуў гэты свет **Марк Шагал,** знакаміты беларускі мастак.

Нарадзіўся ён 7 ліпеня 1887г. у Віцебску дзевятым у сям'і. Яго бацька працаваў на складзе, дзе капцілі сялёдку, а маці трымала лаўку, у якой прадавалася гэтая самая сялёдка. Тым не менш, з хлопца выйшаў выдатны, сусветна вядомы творца, большая частка жыцця якога прайшла, на жаль, па-за межамі Беларусі.

Прыняўшы бальшавіцкі пераварот з энтузіязмам (быў нават два з паловай гады камісарам па культуры ў Віцебску, спрабаваў арганізоўваць разнастайныя выставы, адкрываць музеі і школы), у хуткім часе расчараваўся ў камуністычнай ідэі і эміграваў.

Жыў ён і ў Берліне, і ў Парыжы, і ў Нью-¨рку. Быў двойчы жанаты.

А пайшоў з жыцця на французскай Рыв'еры, дзе жыў апошнія гады.

**Гістарычны сектар**

**ЗАСПЯВАЕМ!**

МЫ ПРАЦЯГВАЕМ ПУБЛІКАВАЦЬ ТЭКСТЫ НАЙБОЛЬШ ПАПУЛЯРНЫХ БЕЛАРУСКІХ ПЕСЕНЬ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЛЮБІЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ З ПЕСНЯМІ ПАД ГІТАРУ І ХАЦЕЎ БЫ СПЯВАЦЬ БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ.

## КРАМБАМБУЛЯ

«АБСЭНТ»

**C-dur A-moll C-dur A-moll**
**D-moll G-dur D-moll G-dur**
**C-dur A-moll**
Pardon, je ne parle pas francais.
Кавярня, прыцемкі, абсэнт...
**D-moll G-dur**
Мігціць наперадзе расстаньне,
І сьвечка на стале згасае...
Рэфрэн:
**C-dur**
Учора, ці сёньня,
Яшчэ ці ўжо...
**A-moll**
Растуць парасоны
Пад цёплым дажджом.
**D-moll**
Усё летуценна,
**G-dur**
І веры няма сабе.
Усё нерэальна,
Нібыта ў сьне:
Начная кавярня,
Агні ў вакне,
І водар растаньня,

Палынны напой - абсэнт.
Усё у жыцьці не назаўжды.
Праходзяць летнія дажджы.
Усё мінае, ўсё знікае,
Тугою зьменіцца каханьне.
Рэфрэн.
Французы кажуць: c'est la vie.
Я буду жыць, і ты жыві.
Запомнім мы кавярню гэту
І пах расстаньня і абсэнту.
Рэфрэн.

# КРАМБАМБУЛЯ: РОК ДЛЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

СКЛАД: ЛЯВОН ВОЛЬСКІ - ВАКАЛ, ГІТАРА; СЯРЖУК КАНАНОВІЧ - ГІТАРА; УЛАДЗІСЛАЎ ПЛЮШЧАЎ - БАС-ГІТАРА; АЛЯКСАНДР «ГАНС» БЫКАЎ - УДАРНЫЯ, АЛЯКСАНДР «РЫБА» ХАЎКІН - СКРЫПЦЫ.

Ідэя праекту ўзнікла некалькі год таму ў лідэра вядомага беларускага гурта N.R.M. Лявона Вольскага падчас паездак за мяжу з вядомым сумесным беларускім праектам - «Народны альбом».

Звярнуцца да гэтай ідэі прымусілі песні, якія не надаваліся да асноўнага выканання групай з нагоды іх «нярокавасці». А тут яшчэ, зыходзячы з плётак музычнага свету Беларусі, адзін знаёмы Вольскага, былы гітарыст гурта Hasta La Fillsta Сяржук Кананові, быў заўважаны ў напісанні нефарматнага для рок-гурта матэрыялу. Паступова вакол іх сабраўся калектыў людзей, якім гэты матэрыял падабаўся.


Лявон Вольскі

Тады, напрыканцы 2001 году, нарадзілася чатырнаццаць песень, якія, па праўдзе кажучы, надаваліся да выканання на інтэлектуальных вяселлях ды бізнэс-прэзэнтацыях. Ну, тут як і падабае, дзелавыя людзі зразумелі што да чаго, і з"явіліся спонсары. Матэрыял быў запісаны ў Польшчы (Лодзь) на студыі Кшыштафа Краўчыка.

Праект у гонар старажытнага шляхецкага напою назвалі «Крамбамбуля» (глядзіце ніжэй), а дыск, які з"яўляецца вынікам пладавітай творчасці музыкаў, атрымаў назву «Паўлітра добрага настрою». Дарэчы выйшаў дыск у 2002 годзе. У чэрвені рэжысёрам Уладзімерам Маркевічам быў зняты відэакліп на песню «Абсэнт», якая уваходзіць у вышэй узгаданы альбом. Прэм"ера адбылася ў верасні, а лістапад быў адзначаны вялізарным сольным канцэртам у Менску. Па выніках продажу за 2002 год альбом «Крамбамбуля» стаў адным з найлепшых беларускіх рэлізаў.

Хацелася б дадаць некалькі словаў пра кліп, які быў зняты на песню «Абсэнт». Здымалі кліп летам, у адной з менскіх кавярняў, дзе паспрабавалі ўзнавіць атмасферу даваеннага Парыжу шляхам дэкарацый, касцюмаў і спецэфектаў, выкарыстаных падчас мантажу і апрацоўкі.

У кліпе ў ролі музы знялася музычная журналістка і тэлевядучая Кацярына Нявінская. Яшчэ адным з герояў кліпа стаў бас-гітарыст праекта Уладзіслаў Плюшчаў. У выніку атрымалася рэч падобраму настальгічная і ў меру рамантычная.

**Сымон МУЗЫКА**

## «ЕЎРАБАЧАННЕ 2004» - БЕЛАРУСКІ ДЭБЮТ

ПЕРШЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАНАЛ БУДЗЕ ВЕСЦІ ТРАНСЛЯЦЫЮ З КОНКУРСУ ПЕСНІ «ЕЎРАБАЧАННЕ» У 2004 ГОДЗЕ З УДЗЕЛАМ БЕЛАРУСКАГА ВЫКАНАЎЦЫ.

У сакавіку 2004 году ў конкурсе «Еўрабачанне» будзе ўпершыню прымаць удзел беларускі выканаўца. Ужо зараз плануецца, што Першы нацыянальны тэлеканал (БТ-1) абавязкова будзе весці трансляцыю гэтай важкай для Беларусі падзеі.

Канцэрт песні «Еўрабачанне» - адзін з самых прэстыжных конкурсаў у Еўропе. Пачынаючы з 1956 году, ён заўжды быў зоркавай фабрыкай: Селін Дыён, Хуліа Іглесіас, «АББА» сталі вядомымі дзякуючы «Еўрабачанню».



Дагэтуль многія краіны, якія жадалі прыняць удзел у фэсце, не мелі такой магчымасці з-за жорсткіх правілаў, што абмяжоўвалі колькасць удзельнікаў. Аднак, пачынаючы з наступнага году, аніводная з краін, якая падасць заяўку на ўдзел у конкурсе, не будзе выкрэсліваццa з ліку канкурсантаў. У сувязі з гэтым, пачынаючы з 2004 году, гледачам Еўропы будзе прадастаўляцца магчымасць сачыць за фестывалем на працягу не аднаго, як гэта было раней, а дзьвух дзён.

Тым часам Белтэлерадыёкампанія ўжо пачала падрыхтоўку да «Еўрабачання 2004». БТ будзе мець непасрэдныя адносіны да выбару песні. А напрыканцы лета будзе вызначаны склад журы і аб"яўлены парадак правядзення нацыянальнага конкурсу песні.

Нацыянальнае журы, па патрабаваннях «Еўрабачання», будзе складацца з васьмі чалавек: чатыры спецыяліста (музыкі, выканаўцы) і чатыры грамадскіх дзеяча, якія не займаюцца музыкай прафесійна.

Такім чынам, у 2004 годзе беларускія гледачы змогуць пабачыць адно з найбольш важных тэлевізійных здарэнняў - конкурс «Еўрабачанне» з удзелам беларускага канкурсанта.

**Сымон МУЗЫКА**

## ГАТУЕМ КРАМБАМБУЛЮ

УВАГА! НАПОЙ ПРЫЗНАЧАНЫ ВЫКЛЮЧНА ДЛЯ ДАРОСЛЫХ.

Каб прыгатаваць гэты традыцыйны беларускі напой, трэба ўзяць 250 грамаў гарэлкі або спірту і развесці з такой жа колькасцю вады. Дадаць чвэрць расцёртага мускатнага арэха, адну або дзьве сталовыя лыжкі мёду, чайную лыжку карыцы, чатыры лыжкі тоўчанай гваздзікі, чатырыпяць лыжак чырвонага перцу. Усё гэта кіпяціць дзесяць хвілін, даліць яшчэ 250 грамаў гарэлкі (вельмі асцярожна) і даць магчымасць пастаяць у зачыненай пасудзіне хвілінаў пяць. Пасля працадзіць праз чатыры слаі марлі ў бутэльку, куды перад гэтым бросіць дзве-тры гарошыны чорнага перцу, даць настаяцца. Спажываць халодным.

**А. СТАГРАМОВІЧ**

P.S. Чаму трэба піць крамбамбулю:

Крамбамбулю можна захоўваць у любой пасудзіне, у тым ліку і ў бутэльках. Пустую бутэльку з-пад крамбамбулі можна запоўніць запальнай вадкасцю і падпаліць нямецкі танк.

Крамбамбуля дапамагае касіць пад п"янага.

Найлепшыя дні, каб выпіць крамбамбулю: 2, 14 студзеня, 24 лютага, 9 сакавіка, 2, 3, 10 і 11 траўня, а таксама ўсе астатнія паслясвяточныя дні.

# МАТРЫЦА 2: ПЕРАЗАГРУЗКА

ПРАЦЯГЛЫ ПЕРЫЯД, КАЛІ АБ НОВАЙ «МАТРЫЦЫ» БЫЛО БОЛЬШ РАЗМОЎ, ЧЫМ СПРАЎ, НАРЭШЦЕ ПРАЙШОЎ. ЗДЫМКІ ФІЛЬМУ ЗНАХОДЗЯЦЦА НА САМЫМ ПРАДУКЦЫЙНЫМ ЭТАПЕ, АКЦЁРЫ БОЛЬШ-МЕНШ АЗНАЁМЛЕНЫ З ТЫМ, ШТО ІМ ТРЭБА БУДЗЕ ВЫКАНАЦЬ НА ЭКРАНЕ. У СУВЯЗІ З ТЫМ, ЕСЦЬ НАГОДА ЗРАБІЦЬ НЕКАЛЬКІ ЗАЎВАГ.

Падчас прэс-канферэнцыі на студыі Fox Studios Australia ў Сіднэе Кіану Рыўз прыадчыніў завесу сакрэтнасці над сюжэтам «Перазагрузкі».





У прыватнасці Кіану Рыўз паведаміў, што браты Вачоўскія вырашылі праверыць уласныя сілы, а таму перанеслі дзеянне новага фільму за межы Матрыцы. Асноўныя падзеі другога фільму будуць адбывацца ў Сіоне. Кіану пракаментаваў гэты факт так: «Тое, што мы можам рабіць у самой Матрыцы - гэтага недастаткова. І мой герой па-ранейшаму знаходзіцца на шляху новых адкрыццяў. ¨н яшчэ толькі павінен зрабіць свой выбар. Аракул яму скажа, што Неа зробіць выбар, які акажа моцны ўплыў на будучыню ўсёй чалавечай расы, аднак гэтаму будуць чыніцца рознага плану перашкоды. І мы ўтрох, Трыніці, Морфіус і Неа, будзем ратаваць свет».

Акрамя таго працягваецца тэма ўзаемаадносінаў паміж Неа і Трыніці, Морфіусам і Агентам Смітам. Яму давядзецца зрабіць новыя адкрыцці і выбар. Да гэтага ж з"явіцца новая інфармацыя аб ягоным паходжанні. ¨н жадаў даведацца, дзе гэта адбылося. Зараз ён гэта ведае, ці думае, што ведае...

Да выступу Кіану Рыўза далучыўся Джоэл Сільвер (пастаноўшчык спецэфектаў), які заверыў прэсу, што візуальныя эфекты, якія будуць выкарыстаныя ў фільме, будуць лепшыя за ўсе вядомыя да гэтага спецэфекты. ¨н сказаў: «Калі мы рабілі першы фільм, у нас не было такой шалёнай колькасці грошаў на ўсе нашыя задумкі». Эфект палёта кулі (як называюць яго самі пастаноўшчыкі - эфект «Часу кулі»), па словах прадзюсэра, можна аднесці да каменнага века.

Адносна эфектаў хацелася б дадаць, што пасля выхаду фільму «Палёт...» пачалі паўтараць усе. Першымі сталі тэлевізійныя праграмы, пасля гэтая мода перайшла да кінафільмаў. Справа не толькі ў скрадзеным эфекце, але ж і ў рухах камеры, палажэнні рук герояў. Па-большасці, тады было выдумана тое, што з лёгкасцю можна выкарыстоўваць у любым фільме.

Былі браты Вачоўскія ўсцешаныя гэтым? На маю думку, напачатку ім гэта дастаўляла асалоду. Са слоў Сільвера можна зрабіць наступныя высновы: браты разлзаваліся і вырашылі стварыць такія візуальныя эфекты, якія б ніхто больш не здолеў паўтарыць.

А самі Вачоўскія сказалі: «Фільм пакладзе канец таму шляху, па якім дагэтуль ішло кіно, таму што далей па гэтаму шляху ісці яно ўжо не зможа. Кампутар дазваляе нам рабіць такія рэчы, пра якія мы раней нават і не марылі. У першым фільме наша сумесная праца з кампутарам знаходзілася на эмбрыянальнай стадыі. Зараз хлопцы знаходзяцца на такім узроўні, што на экране з"явіцца ўсё тое, што мы толькі пажадаем. Яны змогуць стварыць такую бітву, якая можа мець месца толькі ў Матрыцы і нідзе больш».



Здымкі абодвух фільмаў будуць адбывацца на працягу бліжэйшых месяцаў, пасля чаго пачнецца стадыя post-production. Фільмы выйдуць на экраны ў 2003 годзе.

У траўні з"явіцца «Матрыца: Перазагрузка», а восенню плануецца прэм"ера «Рэвалюцыі Матрыцы».

**ICE**

# ФЭСТ ЖЫВОЙ ГІСТОРЫІ

3-4 ЛІПЕНЯ 2000г. У НЯСВІЖЫ АДБУДЗЕЦЦА ФЭСТ СЯРЭДНЯВЕЧНАЙ КУЛЬТУРЫ "СТАРАДАЎНІ НЯСВІЖ", ПРЫСВЕЧАНЫ 780-ГОДДЗЮ ГОРАДА. ПРАГРАМУ ФЭСТУ АРГАНІЗАТАРЫ СФАРМУЮЦЬ ПА ПРЫНЦЫПОВА НОВЫМ ДЛЯ БЕЛАРУСІ ПАДЫХОДЗЕ – УВАСАБЛЕННІ КАНЦЭПЦЫІ "ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ": РЭКАНСТРУКЦЫІ КУЛЬТУРЫ IX-XVI СТАГОДДЗЯЎ, ДЭМАНСТРАЦЫІ І ДАЛУЧЭННІ ДА ГЭТАЙ СПРАВЫ ГЛЕДАЧОЎ.

Напрацягу двух дзён на гарадскіх пляцоўках адначасова будзе гучаць сярэднявечная і фальклёрная музыка. Сёлета ў Нясвіжы ў параўнанні з ранейшымі падобнымі імпрэзамі будзе значна пашыраная "сярэднявечная музычная геаграфія" - чакаюцца госці не толькі з суседніх краінаў, але і са Швейцарыі і Вялікабрытаніі.



Будуць узноўленыя абрады, тэатр, рамёствы, тэхналогіі, стравы, напоі, фехтавальнае майстэрства, медыцына, водныя і "сухапутныя" гульні і забавы. Адна з галоўных мэтаў паказальна-дэманстрацыйнай праграмы - даць гледачам магчымасць самім спекчы блін, прымерыць старадаўні строй, выразаць сабе лыжку, зрабіць кавалак кальчугі, аддрукаваць грамату. Яшчэ адна акцыя - аднаўленне старой забавы князёў Радзівілаў. Адбудзецца пераадоленне воднай перашкоды - "Гібралтарскага праліву", высадка дэсанту на бераг, штурм навіслай над вадой фартэцыі.

У імпрэзе прымуць удзел жанглёры, акрабаты, факіры, танцоўшчыцы, байцы, каскадзёры ды іншыя "спецыялісты агню" з клубаў розных краін - удзельнікаў Фэсту.



Таксама гледачы даведаюцца пра тое, як выжывалі дыябетыкі у Сярэднявеччы.

Пра гэта і раскажуць, і прадэманструюць на Фэсце на прыкладзе сваіх рэканструкцыяў удзельнікі сярэднявечнага клуба дыябетыкаў.

Арганізатары мяркуюць, што за два дні Фэст у Нясвіжы наведаюць 40-50 тысяч чалавек.

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**

# СТРОИТЬ АЭС?..

ПРЕЗИДЕНТ БЕЛАРУСИ АЛЕКСАНДР ЛУКАШЕНКО СЧИТАЕТ, ЧТО РАНО ИЛИ ПОЗДНО НАШЕЙ СТРАНЕ ПРИДЕТСЯ УЙТИ ОТ "ЧЕРНОБЫЛЬСКОЙ БОЯЗНИ" И СТРОИТЬ НОВУЮ, ТЕХНОЛОГИЧЕСКИ СОВРЕМЕННУЮ И БЕЗОПАСНУЮ АТОМНУЮ ЭЛЕКТРОСТАНЦИЮ.

Как заявил глава государства, выступая 15 февраля в Белорусском государственном университете информатики и радиоэлектроники, собственная АЭС является одним из краеугольных камней суверенитета и независимости Беларуси. Александр Лукашенко сообщил, что вопрос о строительстве атомной электростанции в Беларуси находится в стадии проработки.

Я искренне надеюсь, что большая часть белорусов выскажется против строительства Белорусской АЭС. В 1997 году строительство АЭС в РБ уже обретало конкретные черты, но парламентские слушания по атомной и альтернативной энергетике поставили на этой идее крест - финансирование проектирования белорусской атомной электростанции было прекращено.

Наиболее развитые страны имеют самое большое количество атомных электростанций, но в последнее время мораторий на новые АЭС дефакто либо де-юре действует почти везде в Западной Европе. Большинство развитых стран стремится выводить из эксплуатации действующие атомные станции. Вместе с тем Запад развивает альтернативную энергетику, более безопасную и более экологически чистую.

Утверждение, что в Беларуси недостаточно хорошие условия для развития ветряных и гелиоэлектростанций неверно. Концепция альтернативной безъядерной энергетической программы Беларуси публиковались в книге "Electricity in Eastern Europe. 10 years after Chernobyl" Berlin, 1996 г., 1997 г. (2-ое издание).

К тому же наличие атомной станции подразумевает риск аварии. Современные системы безопасности, конечно, совершенны, они сводят риск аварии к минимуму. Но риск аварии есть, и в общественном сознании будет постоянно присутствовать мысль: "А вдруг второй Чернобыль?". Теракты 11 сентября показали, например, что обезопасить АЭС от атак с воздуха практически невозможно.

Стоимость строительства АЭС оценивается в 450 млрд евро. У нашей республики есть возможность выделить эти средства? Кредит на строительство выделит разве что Россия.

Конечно, АЭС после запуска будет обеспечивать стабильное поступление какой-то части электроэнергии на протяжении десятка лет, а себестоимость данной электроэнергии будет ниже, чем у других видов электростанций. Но ведь можно найти другой выход!

Если не хватает электроэнергии, то почему мы продаём энергию с Берёзовской ГрЭС в Польшу? Почему нельзя внедрить неэнергоёмкую промышленность, развить альтернативную энергетику?




Фота: IREX/ProMedia

**Словы з гімна СССР на сцяне дома ў горадзе-прывідзе Прыпяць, насельніцтва якога (30 тыс.) было эвакуіравана пасля трагедыі**

Если уменьшить количество потребляемой электроэнергии, то необходимость постройки атомной электростанции отпадает сама собой. Посудите сами - деньги лучше вложить сразу в новейшее производство и технологии, чем поддерживать давно устаревшее оборудование и строить дополнительно к нему АЭС.

Если, конечно, постройка Первой атомной электростанции не преследует никаких политических целей.

**ДИКИЙ**

# НОВЫЙ ЗАКАЗНИК НА БРЕСТЧИНЕ

НА ЮГЕ БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ БУДЕТ СОЗДАН ПРИРОДНЫЙ ЗАКАЗНИК "ПРИБУЖСКОЕ ПОЛЕСЬЕ"

Создание государственного ландшафтного заказника республиканского значения "Прибужское полесье" общей площадью 7 тысяч гектаров начнётся в нынешнем году на территории Брестского района, на границе с Украиной и Польшей. Инициатива создания заказника на этой территории принадлежит белорусским ученым и их коллегам из соседних стран. Местной особенностью является то, что здесь произрастает более 20 видов растений, занесённых в Красную Книгу Беларуси, в том числе уникальных - королевский папоротник и белорусская орхидея – венерин башмачок. Здесь же находится самая южная точка таёжного растения - берёзы низкой.

На территории будущего заказника насчитывается также более 40 видов животных, занесённых в Красную Книгу, среди которых популяции летучих мышей, серый ушан и ночница бранда.

Научное обоснование создания ландшафтного заказника уже готово. В настоящий момент ведётся подготовка административных документов, уточняются границы и землепользователи.

Параллельно с созданием государственного ландшафтного заказника ведутся переговоры о создании международного биосферного заповедника, который объединит "Польский полесский парк", украинский "Шацкий природный национальный парк" и вновь создаваемый заказник "Прибужское полесье".

# СТРОИТЕЛЬСТВО ГРОДНЕНСКОЙ ГЭС ОПАСНО ДЛЯ НЁМАНА

В этом году начнется строительство Гродненской гидроэлектростанции. Запланировано построить две электростанции: крупную - в районе Гродно - мощностью до 17 МВт, и небольшую - на Августовском канале - мощностью 250 кВт. "Станцию на канале мы строим не для получения энергии, потому что мощность небольшая. Ее появление на Августовском канале привлечет инвестиции в эту зону и позволит развивать там туризм", - считает главный инженер. Деньги на проект будет выделять концерн "Белэнерго". Итоги тендера будут известны в марте.

Против строительства станции выступает областной комитет охраны окружающей среды и местное экологическое общество, представители которого называют этот проект "убийством для Нёмана". По словам координатора общественного проекта ихтиолога Нины Полуцкой: "главная опасность строительства ГЭС - в изменении гидрологии реки. Нёман имеет подвижное русло, которое формируется под постоянным воздействием песчаных и галечных наносов. Плотина перекроет песчаные потоки, и ниже её могут образоваться глубокие рвы длиной до 10 км. Таким образом, Нёман уйдет вглубь. Оголятся берега, мостовые подпорки, подводные магистрали..."

**ДИКИЙ**

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня “Дзедзіч” шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці. Тэл. (0162) 22-90-97.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці. Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 22-90-97.**

АБ'ЯВЫ

# КОНКУРС ЭКАНАМІЧНЫХ ДАСЛЕДВАННЯЎ "ВЯСНА-2003"

Дадзены конкурс накіраваны на падтрымку даследванняў, звязаных з вырашэннем актуальных праблем эканомікі краін СНД.

Фінансаванне праектаў ажыццяўляецца ў форме індывідуальных грантаў. Заявы, што прайшлі папярэдні адбор, будуць прадстаўлены на навуковым семінары ў сярэдзіне ліпеня 2003 года, прамежкавыя вынікі па фінансуемых праектах - у снежні 2003 г., канчатковыя вынікі - улетку 2004 г. Вынікам даследвання мусіць стаць навуковы даклад/артыкул. Да ўдзелу запрашаюцца даследчыкі-эканамісты з краін СНД.

Памер гранта складае ад 6 да 15 тысяч долараў. Заявы на ўдзел у конкурсе "Вясна 2003" павінны быць накіраваныя па пошце не пазней 20 красавіка 2003 г. альбо дастаўленыя кур'ерам да 16:00 25 красавіка ў Маскоўскі сакратарыят Кансорцыума па адрасе: 117418 Масква, Нахимовский проспект, 47, офис 919, 9 этаж. Больш падрабязную інфармацыю і ўзоры заяваў можна знайсці на сайце www.eerc.ru.

**Dzedzich week-news**

# "РАДА" ЗАПРАШАЕ ПРАВЕСЦІ "СТРАТЭГІЧНЫЯ ПЕРАМЕНЫ"

Беларускі саюз моладзевых і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў "РАДА" запрашае кіраўнікоў моладзевых НДА прыняць удзел у міжнароднай канферэнцыі "Стратэгія пераменаў", якая пройдзе 11-14 красавіка. Мэта канферэнцыі - выпрацаваць стратэгію змянення існуючай сітуацыі у галіне моладзевай палітыкі на нацыянальным і міжнародным узроўні. Удзельнікамі канферэнцыі стануць прадстаўнікі моладзевых нацыянальных радаў еўрапейскіх краінаў і краінаў СНД, моладзевых арганізацый і дзяржаўных структур. Удзел у канферэнцыі можа прыняць 1 чалавек ад арганізацыі. Прыярытэтам пры адборы ўдзельнікаў карыстаюцца НДА, якія прымалі ўдзел у мерапрыемствах праекта "Стратэгія развіцця моладзевых арганізацый у Беларусі". "Рада" бярэ на сябе выдаткі па харчаванню і пражыванню іншагародніх удзельнікаў, а таксама кампенсуе выдаткі на праезд.

Для ўдзелу ў мерапрыемстве патрэбна запоўніць анкету-заяўку. Форму заяўкі можна атрымаць па адрасу: (017) 222 30 05, rada@user.unibel.by. Адказная асоба - Вольга Сацук.

Апошні тэрмін падачы заявак - 25 сакавіка.

У рамках канферэнцыі плануецца таксама правесці азнаямляльныя візіты для замежных удзельнікаў у моладзевыя арганізацыі. Менскія арганізацыі, якія жадаюць прыняць у сябе міжнародных удзельнікаў, могуць запоўніць спецыяльныя "Бланкі на візіт" і вызначыць валанцёра, адказнага за візіт замежных гасцей.

**Dzedzich week-news**

# НОВЫЯ ЭКАЛАГІЧНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ПРАГРАМЫ

Міжнародная трэнінгавая кампанія SMS-USA прапануе дзве новыя экалагічныя навучальныя праграмы на 2003 год: "Як пазбегнуць непатрэбных экалагічных праблем" і "Тэндэнцыі развіцця экалагічнага лідэрства і зацікаўленых бакоў".

За больш падрабязнай інфармацыяй неабходна звяртацца:
Lee Gary, Owner, SMS-USA, 2837 Carondelet Street, New Orleans, Louisiana 70115.
E-mail: SMSUSANO@CS.com.

**Dzedzich week-news**

**Клуб «Дзедзіч» шукае добраахвотніка**

**WEB-ДЫЗАЙНЕРА**

**(з сярэднім узроўнем валодання WEB-праграмаваннем), які б дапамагаў нам у абнаўленні і ўдасканаленні сайта арганізацыі: http//:dzedzich.vezha.unibel.by.**
**На жаль, мы не можам аплаціць гэтую працу, але каву, гарбату і добрую сяброўскую атмасферу гарантуем.**
**Тэл.: 22-90-97.**




*АБ'ЕКТЫЎНА ПРА РЭАЛЬНАЕ*
**RR**
**РАДЫЁ РАЦЫЯ**
***НА КАРОТКІХ ХВАЛЯХ***
*6035 кГц (49 м) 08:00-10:00*
*6180 кГц (49 м) 13:00-15:00*
*6050 кГц (49 м) 21:00-23:00*
***НА СЯРЭДНІХ ХВАЛЯХ***
*612 кГц (490 м) 07:00-11:00*
**WWW.RACYJA.PL**

Брэсцкае абласное аддзяленне
**Грамадскага аб'яднання ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР**
**«ВЯСНА»**
**Звяртайцеся на адрас:** г. Берасце, бульвар Шаўчэнкі, д. 7, кв. 24.
Тэл./факс: (0162) 20-13-95.

**БЕЛАРУСКАЯ ПАЛІЧКА ЗАПРАШАЕ**

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць буйнейшую беларускую электронную бібліятэку! Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**
Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.
**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

**ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!**

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв.2.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго: ____________________

**УВАГА!**

Працягваецца бясплатная падпіска

**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч" для асоб, што не жывуць у г. Берасці.**

Калі ты жадаеш атрымоўваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:

**224000, г.Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв. 2.**

Чаму ты вырашыў падпісацца: ____________________

Прозвішча: ____________________

Імя: ____________________

Імя па бацьку: ____________________

Паштовы адрас: ____________________

Тэлефон: ____________________

## ДАРЭЧЫ

Вясновыя гульні «Што? Дзе? Калі?», вядучы:

- Трэці раунд. Пытанне ад студэнткі філалагічнага факультэта Каці Зеленаградавай. Паглядзіце на манітор, у нас ёсць яе фотаздымак. А для тэлегледачоў нагадваю, што па тэлефоне 555-55-51 звоняць тыя, каму пытанне спадабалася, па тэлефоне 555-55-52 звоняць тыя, каму пытанне не спадабалася, ну а па тэлефоне 234-45-68 пасля 20.00 могуць пазваніць тыя, каму спадабалася студэнтка.

***

У Адама Глёбуса спыталіся: "Ці праўда, што ў Маскве ўсе размаўляюць па-беларуску?" ¨н падумаў, і адказаў: "Так. Ня горш, чым у Менску."

***

Ляцяць у верталёце маладыя спецыялісты да месца накіравання над самым глухім кутком Палесся... Праз пэўны час пілот крычыць:

- Усё! Прыляцелі! Прыгайце!
- Да паглядзі, вышыня та якая! Разаб”емся!
- Добра! Зніжаемся. Вышыня 25 метраў! Прыгайце!
- Ніжэй спускайся! Разаб”емся!
- Ніжэй не магу! Пачнуць запрыгваць маладыя спецыялісты з мінулага году!

***

Плыве падводная лодка. 25 лютага. На караблі страшэнны 3-хдзённы запой. Пасля працяглага перапынку прыходзіць у сябе капітан:

- Штурман, блін, нашыя каардынаты??!!

Штурман (таксама ніякі):

- Аблом, капітан, якія каардынаты?

Капітан (вельмі злосна, моцным намаганнем волі):

- Значыцца так, падняць перыскоп! Што па курсе?
- Па курррсе трррaулеррр...

Капітан:

- Дык вось, блін, штурман, слухай сюды! Уключыць рацыю! Правы борт - рры..тууууйсь..., залп! Значыць так! Зараз будзе сігнал SOS, затым каардынаты, і каб гэта было ў апошні раз! Налівай!!

***

Зламаў прынтар - выратаваў дрэва!

***

Рэкламная акцыя: калі ў радзільным доме ў вас з'явілася трэцяе дзіця - чацвёртае мы падорым вам бескаштоўна!

***

Учора ў службу выратавання 911 паступіў трывожны званок...

Выратавальнікі неяк занерваваліся і вырашылі не браць слухаўку.

***

З разумнай жанчынай можна размаўляць пра ўсё, з прыгожай - усё роўна, пра што размаўляць.

***

"Энцыклапедыя расейскай карупцыі: ад А да Ю". /Г. А. Яўлінскі/.

***

Пазнаёміўся адзін мужык з дзяўчынай. Паехалі яны ў гатэль адсвяткаваць знаёмства. Выходзяць з машыны на стаянцы гатэля. ¨н глядзіць - а побач стаіць машына яго сябра. Дай, думае, пажартую... Зняў у яго каўпак з кола.

На наступны дзень паехаў ён да сябра. Той адчыняе яму дзверы. Мужык падміргвае яму вокам:

- Як яна? Прыгожая? - пытае.
- Хто? - не разумеючы, адказвае сябра.

Мужык паказвае яму каўпак і кажа:

- Учора ў гатэлі...

Сябра паварочвае галаву ў бок пакоя:

- Дарагая - прынеслі каўпак, які ты ўчора ў супермаркеце згубіла...

***

Па выніках галасавання ад 14 лютага 2003 года на самым наведваемым сайце показак у расейскім інтэрнэце «показкі з Расеі» лепшай прызнана показка пра Аляксандра Л.:

«Навучыўся Аляксандр Л. ў хакей гуляць - у Менску пабудавалі Лядовы палац, навучыўся ён гуляць у футбол - пабудавалі ў Менску крытую футбольную пляцоўку. Зараз у Менску будуюць бібліятэку...».

***

Інспектары ААН у Іраку знайшлі аўтамат Калашнікава з надпісам: "Зроблена не ў Беларусі".

***

Трапілі ў яму заафіл, некрафіл, педафіл і мазахіст. Заафіл кажа:

- Зараз бы сабачку.
- Маленькага,-кажа педафіл.
- Мёртвага,-дадаў некрафіл.
- Гаў,- сказаў мазахіст.

***

Заходняя Беларусь. Расейскі турыст у беларускай вёсцы пытае дзеда, які сядзіць каля хаціны (з расейскім акцэнтам, натуральна):

- А где здесь грибочки пособирать можно?

Дзед яму адказвае:

- А ты іх, маскалiку, саджаў?!

ВНИМАНИЕ!

# ОБЪЯВЛЯЕТСЯ НАБОР В ШКОЛУ МОЛОДЫХ ПОЛИТИКОВ

**Темы лекций:** избирательное законодательство и избирательные технологии; "чёрный пиар" и борьба с ним; политические системы; статус и полномочия депутатов различных уровней.

Предполагается, что лучшие слушатели будут иметь возможность пройти стажировку в странах Восточной Европы и получить практические навыки политической деятельности в РБ.

**Обучение бесплатное.** Занятия будут проходить в вечернее время 2 раза в неделю.

**Срок обучения -** 2 месяца (июнь-июль 2003г.).

Преподаватели: тренеры Национально-демократического института США.

Количество мест ограничено. **Критерии отбора:**

- Возраст: 18-30 лет (предпочтение - лицам с высшим образованием и студентам ВУЗов);
- Желание и возможность принять участие во всех мероприятиях программы;
- Желание и возможность реализовать полученные знания на практике;
- Оперативность, полнота и достоверность ответов на вопросы анкеты.

**Для участия в программе необходимо ответить на вопросы анкеты-заявки:**

1. ФИО. 2. Контактный адрес, тел., e-mail. 3. Место работы, учёбы (указать полностью).
4. Возраст. 5. Партийность.
6. Членство в общественных и религиозных организациях.
7. Почему Вы решили принять участие в программе подготовки молодых политиков?
8. Опыт участия в избирательных кампаниях, другой политической деятельности (если есть).
9. Каким образом Вы планируете применить полученные знания и опыт?
10. Какими, на Ваш взгляд, должны быть перспективы развития Беларуси в следующих областях:
a) Экономика; b) Социальная сфера; c) Образование; d) Национальная культура и язык;
e) Внешняя политика; f) Права человека.

**Объём анкеты-заявки - до 2-х печатных листов формата А4.**

**Анкеты-заявки присылать до 1 мая 2003 г. по адресу:** г. Брест, ул. Ленинградская, д. 1, кв. 81.

**Доп. информация по тел.: (029) 641-20-98.**

БРЭСЦКАЯ ГАРАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

# ПАРТЫЯ БНФ

распачынае новую агульнагарадскую кампанію **"РАЗАМ ЗА ЕЎРАПЕЙСКІ ДАБРАБЫТ".**

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Разам мы:**

- **Пабудуем** сучасную эфектыўную гаспадарку;
- **Усталюем** парадак і вяршэнства Закона;
- **Адстаім** незалежнасць нашай Радзімы;
- **Знішчым** усеўладдзе і карупцыю чынавенства.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**

**Ты зможаш:**

- **Атрымаць** кваліфікаваную прававую дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях;
- **Прайсці** курсы палітычнай і грамадзянскай адукацыі ў Беларусі і за мяжой;
- **Зрабіць** кар'еру адукаванага і перспектыўнага палітыка;
- **Навязаць** кантакты з нашымі партнёрамі ў краінах Еўропы;
- **Знайсці** новых сяброў, з карысцю для сябе і для Бацькаўшчыны праводзіць вольны час.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ,** каб шчыра казаць сваім дзецям і ўнукам: "Я зрабіў усё, каб ваша жыццё было шчаслівым"!

**Як стаць сябрам партыі БНФ?**

**Тэлефануй: (029) 660-57-41.**

№2 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
сакавік 2003

ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 25.03.2003 у 18⁰⁰
**Наклад:** 299 асобнікаў.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Дземідзюк, Д. Дзянісаў, Д. Шастак, М. Есіна, А.Верамчук, У. Чаберкус
**Адказны сакратар:** М. Сялягін. **Вёрстка:** А. Ляўчук

**Кантактны тэлефон:** (0162) 22-90-97
**E-mail:** dzedzich@mail.ru